9. *Рябцева, Л. Н.* Информационное обучение пользователей как условие развития образовательной функции библиотеки : автореф. дис. … канд. пед. наук : 05.25.03 / Л. Н. Рябцева ; Гос. публичная науч.-техн. б-ка Сибирского отделения Рос. акад. наук. – Новосибирск, 2012. – 18 с.
10. *Терешин, В. И.* Современные проблемы развития педагогических функций библиотек / В. И. Терешин // Развитие педагогических функций советских библиотек : межвуз. сб. науч. тр. / отв. ред. В. И. Терешин. – М. : МГИК, 1991. – С. 5–25.

**М. Г. Пшыбытка,** *загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства;*
**А. Е. Далгаполава,** *кандыдат педагагічных навук, першы намеснік дырэктара па абслугоўванні карыстальнікаў і ідэалогіі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЫКАНАННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРАГРАМЫ «КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ»

З’яўляючыся шматфункцыянальнымі ўстановамі культуры, публічныя бібліятэкі добрасумленна выконваюць шэраг сацыяльна значных задач: прадстаўляюць грамадзянам рэспублікі свабодны доступ да інфармацыі і ведаў, у тым ліку да апошніх дасягненняў сусветнай і айчыннай навукі, ствараюць умовы для духоўнага і маральнага развіцця чытачоў.

Функцыянуючы ва ўмовах павелічэння аб’ёму інфармацыі і працуючы над яе арганізацыяй, бібліятэкі выступаюць у якасці сацыяльнага фактару, які стабілізуе грамадства і здольны забяспечыць яго інфармацыйную бяспеку і ўстойлівасць, ураўнаважыць розныя інфармацыйныя магчымасці рэгіёнаў.

Мэта развіцця бібліятэчнай галіны Рэспублікі Беларусь да 2015 г. вызначана ў Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. (далей – Праграма) як «забеспячэнне свабоднага і роўнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў і бібліятэчных фондаў для розных груп насельніцтва». Эфектыўнасць рэалізацыі названай мэты вызначаецца Праграмай як дасягненне шэрагу паказчыкаў, сярод якіх:

– актывізацыя абнаўлення фондаў да 5 % у год;

– павелічэнне колькасці наведванняў, у тым ліку – аддаленых карыстальнікаў, на 5 % да 2015 г.;

– поўная камп'ютарызацыя бібліятэк з падключэннем да сеткі Інтэрнэт і арганізацыяй электроннай пошты з улікам абнаўлення камп'ютарнага парку па 20 % у год.

Развіццё бібліятэчнай справы ў адзначаных накірунках патрабавала перш за ўсё ўдасканаленне яе заканадаўчай базы. На рашэнне дадзенай задачы накіраваны шэраг заданняў Праграмы, частка з якіх выканана. У прыватнасці, з 9 лістапада 2014 г. уступілі ў сілу змяненні і дапаўненні, унесеныя ў Закон аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь. Наступныя заданні, якія знаходзяцца на стадыі выканання, і, спадзяёмся, будуць паспяхова рэалізаваны на працягу астатняга часу, – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры і новая рэдакцыя стандарту Беларусі 7.20-2000 «Бібліятэчная статыстыка. Асноўныя палажэнні».

Дасягненню асноўных паказчыкаў, замацаваных у Праграме, павінны былі спрыяць заданні, звязаныя з абсталяваннем бібліятэк камп'ютарнай тэхнікай, набыццём праграмнага забеспячэння, сервернага абсталявання, тэфлаабсталявання, капітальным рамонтам будынкаў і шэраг іншых.

На працягу чатырох гадоў рэалізацыя Праграмы адбывалася на фоне сутнасных – колькасных і якасных – змен у бібліятэчнай сетцы. Па стане на пачатак 2015 г. у ведамстве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь знаходзіцца 2999 бібліятэк: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 6 абласных бібліятэк і 2992 публічныя бібліятэкі мясцовых органаў улады.

За апошнія 20 гадоў сетка публічных бібліятэк скарацілася амаль у 2 разы. У аснове гэтых змен ёсць аб'ектыўныя прычыны – колькасны склад сельскага насельніцтва паступова памяншаецца. У той жа час тэмпы скарачэння бібліятэчнай сеткі павінны адпавядадаць тэмпам зніжэння колькасці жыхароў у сельскай мясцовасці. Толькі ў гэтым выпадку публічныя бібліятэкі будуць заставацца агульнадаступнымі, набліжанымі да месца жыхарства карыстальнікаў. Пачынаючы з 2011 г., тэмп скарачэння колькасці бібліятэк стаў значна пераўзыходзіць скарачэнне колькасці насельніцтва і ў 2014 годзе дасягнуў наступных суадносін: скарачэнне сельскага насельніцтва – 2 %; скарачэнне бібліятэк – 12 %.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2011–2012 гг. у рэспубліцы пачаты эксперымент па аб'яднанні публічных і школьных бібліятэк, размешчаных у сельскай мясцовасці. Аб'яднанне праходзіла ў адпаведнасці з Планамі паэтапнай інтэграцыі ў 2012–2014 гг., распрацаванымі аблвыканкамамі і Метадычнымі рэкамендацыямі па інтэграцыі (аб'яднанні) сельскіх публічных бібліятэк і бібліятэк устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і арганізацыі іх дзейнасці, зацверджанымі ў 2012 годзе Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Паводле аператыўных даных, на 01.01.2015 у Беларусі функцыянуюць 444 аб'яднаныя бібліятэкі. З агульнай колькасці аб'яднаных бібліятэк 31 бібліятэка (7 %) перайшла ў ведамства Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, што супярэчыць названым Рэкамендацыям. Гэта 25, або 60 %, ад колькасці аб'яднаных бібліятэк у Гродзенскай вобласці, 5, або 11 %, – у Брэсцкай, 1, або 1 %, – у Мінскай вобласці. У іншых галінах усе аб'яднаныя бібліятэкі засталіся ў ведамстве Міністэрства культуры. Аб'яднанне сельскіх публічных і школьных бібліятэк ажыццяўлялася на падставе адпаведных рашэнняў раённых выканаўчых камітэтаў.

Асноўнымі праблемамі, якія ўзнікаюць у дзейнасці аб'яднаных бібліятэк у выпадку іх пераводу ў ведамства Міністэрства адукацыі, спецыялісты на месцах адзначаюць: неадпаведнасць камплектавання фонду аб'яднаных бібліятэк літаратурай універсальнага характару патрэбам насельніцтва; адсутнасць механізму прадастаўлення дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці аб дзейнасці аб'яднаных бібліятэк, немагчымасць забеспячэння бесперашкоднага доступу ў бібліятэку насельніцтву. Рэжым работы школы і статус школы як напаўзачыненай установы робяць немагчымым наведванне бібліятэкі дарослымі чытачамі ў вячэрні час і выхадны дзень, што зніжае наведвальнасць імі бібліятэк. Неахопленымі застаюцца і дзеці дашкольнага ўзросту. Такім чынам, не ў поўнай меры рэалізуюцца правы грамадзян на бібліятэчнае абслугоўванне, што супярэчыць арт. 51 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і арт.5 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь».

Нягледзячы на скарачэнне сеткі бібліятэк, колькасць наведванняў паступова павялічваецца. Па выніках 2014 г. перавыканаы агульны паказчык Праграмы на пяцігодку: забяспечана 27 480 тыс. пры плане 26 565 тыс. на канец 2015 г. У пэўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступені гэтаму спрыяла рашэнне аб уключэнні ў афіцыйную статыстыку наведванняў аддаленых карыстальнікаў.

Паслугамі публічных бібліятэк у 2014 годзе скарысталіся каля 3,4 млн. чалавек. Гэта на 4 % менш, чым у 2013 г., але з улікам колькаснага складу бібліятэк можна лічыць, што ахоп насельніцтва абслугоўваннем пакуль застаецца досыць высокім. У сярэднім кожны трэці грамадзянін Беларусі з'яўляецца карыстальнікам публічнай бібліятэкі. Безумоўна, зберагчы працэнт ахопу насельніцтва дазваляе актыўнае выкарыстанне нестацыянарных форм абслугоўвання, для ажыццяўлення якога выкарыстоўвалася 103 бібліёбусы.

Трэба адзначыць, што ў цэлым эфектыўнасць абслугоўвання павысілася. На дыяграме прадстаўлены суадносіны паказчыкаў па сярэдняй колькасці чытачоў і наведванняў, што прыходзіліся на адну бібліятэку ў 2010 г. і 2014 г. (*мал. 1*):




*Мал. 1. Эфектыўнасць абслугоўвання*

Наяўнасць інфармацыйных рэсурсаў, якія адпавядаюць патрэбам часу, – наступны асноўны складнік дзейнасці бібліятэкі. Таму заканамерна, што адной з задач Праграмы з'яўляецца фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў і іх захаванне. Даручэнне кіраўніка дзяржавы А. Р. Лукашэнкі ад 23 лютага 2007 г. №10 / 48 П269, у адпаведнасці з якім на камплектаванне фондаў публічных бібліятэк павінна выдзяляцца не менш за 15 % ад сумы, якая выдаткоўваецца на ўтрыманне бібліятэкі, усімі абласцямі ў 2014 годзе выканана. Сярэдні паказчык па краіне склаў 16,7 %.

Мэтавы паказчык Праграмы па аб'наўленні фондаў у цэлым па краіне практычна выкананы (4,9 % у год). У той самы час трэба адзначыць, што ён дасягнуты, у асноўным, за кошт спісання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

састарэлай літаратуры. Гэта прывяло да пэўнага памяншэння аб'ёму сукупнага фонду публічных бібліятэк, але, як можна дапусціць, павысіла яго актуальнасць (*мал. 2*):




*Мал. 2. Абнаўленне фондаў*

Па стане на пачатак 2015 г. камп'ютарызавана 76 % агульнай колькасці публічных бібліятэк рэспублікі. У параўнанні з 2010 г., калі толькі 43 % бібліятэк мелі камп'ютарную тэхніку, гэты паказчык выглядае даволі значным. У той жа час, каб адпавядаць міжнародным стандартам у сферы інфарматызацыі, у бібліятэцы павінна быць не менш за адно аўтаматызаванае працоўнае месца на 1 тыс. жыхароў. Сёння машынны парк бібліятэк у 2,7 разы адстае ад паказчыкаў, прадугледжаных праграмай[1] (*мал. 3*):




*Мал. 3. Сярэдняя колькасць камп'ютараў на адну бібліятэку*

[1] У сувязі са змяненнем колькасці бібліятэк у перыяд выканання Праграмы, супастаўленне натуральных велічынь па набыцці камп'ютараў з'яўляецца некарэктным. Таму плануемы і фактычны памер камп'ютарнага парку параўноўваецца шляхам разліку да колькасці бібліятэк у 2010 г. і 2014 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры гэтым амаль палова наяўнага камп'ютарнага парку патрабуе мадэрнізацыі. На 1 тыс. жыхароў у сярэднім па краіне пакуль прыходзіцца 0,7 камп'ютара. Да сеткі інтэрнэт падключаны 62 % публічных бібліятэк (18 % недавыкання мэтавых паказчыкаў). Электронную пошту маюць 60 % бібліятэк (20 % недавыкання мэтавых паказчыкаў).

Праведзены аналіз сведчыць, што ўзровень вынікаў па выкананні мэтавых паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. сутнасна адрозніваецца паміж сабой. Скарачэнне і рэарганізацыя соцень публічных бібліятэк не пацягнула за сабой значнага скарачэння чытацкай аўдыторыіі і яе актыўнасці. Але інфармацыйна-тэхналагічны стан публічных бібліятэк пакуль не дазваляе гаварыць аб тым, што сёння публічная бібліятэка – сапраўдны інфармацыйны цэнтр для насельніцтва.

Застаўся адзін год да завяршэння Праграмы. На калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па выніках работы ў 2014 г. была адзначана неабходнасць надаць больш пільную ўвагу пытанням камп'ютарызацыі бібліятэк. Магчыма, гэта надасць новы імпульс выкананню гэтага мэтавага паказчыка на завяршальным этапе дзеяння Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі».

---

Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 26 снеж. 2010 г., № 1905 : в ред. постановления Совета Министров Респ. Беларусь от 22 авг. 2012 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ